**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

| ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА | |
|---|---|
| Наименование | Характеристика |
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения | комплекс зданий и сооружений рынка, расположенного по адресу: г. Скидель, ул. Ленина, 2, в том числе:<br>– капитальное строение, инв. № 401/С-21527 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное), площадью 122,3 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2 с принадлежностями: пристройка (38 кв.м), ограждение бетонное (114 кв.м), ограждение бетонное (142 кв.м), ограждение бетонное (37 кв.м), ограждение бетонное (121 кв.м), ворота металлические, калитка металлическая, площадка для мусора (9 кв.м), асфальтированная площадка (551 кв.м), навесы (2 ед. 46 кв.м), навес (45 кв.м), навес (47 кв.м), водопроводная сеть (16 м.п.), электрическая сеть (18 м п.), электрическая сеть (20 м п.), ограждение из металлической сетки (27 м п.), ограждение площадки для мусора (4 м);<br>– капитальное строение, инв. № 401/С-21530 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – склад), площадью 26,4 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/1;<br>– капитальное строение, инв. № 401/С-21529 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание павильона «Модуль»), площадью 173,3 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/2;<br>– капитальное строение, инв. № 401/С-21528 (назначение – здание специализированное для бытового обслуживания населения, наименование – уборная), площадью 214,0 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, г. Скидель, ул. Ленина, 2/3;<br>– зеленые насаждения. |
| Земельный участок, на котором расположен объект | кадастровый номер 422050400000200439, площадью 1,4383 га (назначение – земельный участок для обслуживания зданий и сооружений рынка) |
| Начальная цена продажи | 130 002,96 р. (сто тридцать тысяч два рубля девяносто шесть копеек) с учетом НДС |
| Сумма задатка | 13 000 р. (тринадцать тысяч рублей) |
| Условия аукциона | сохранение целевого назначения выставляемого на аукцион объекта (рынок для торговли сельскохозяйственной продукцией, дикорастущими плодами, ягодами и иными продовольственными и непродовольственными товарами, а также животными) |
| Продавец | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел.: 96-06-74 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38 |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 26 декабря 2016 г. в 15.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются: представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя; физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица; представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 13.08.2016 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник - четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 21 декабря 2016 г. до 15.00.**

*Телефон для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/*


# Сезон адкрыты!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У «Сонечнай даліне» можна пакатацца на горных і бегавых лыжах, сноўбордзе і цюбінгу. У комплексе чакаюць не толькі лыжнікаў з вялікім вопытам, але і пачаткоўцаў. Штодня працуе малы (вучэбны) схіл, на ўсіх горках ёсць інструктары, гатовыя прыйсці на дапамогу. Для камфортнага адпачынку прадугледжаны, вядома, і пад'ёмнікі. Акрамя гэтага, спецыялісты гарналыжнага цэнтра забяспечваюць комплексны сэрвіс лыж і сноўбордаў.

**Кошты:**

*пракат гарналыжнага камплекта (лыжы, абутак, палкі) або пракат камплекта для сноўборда (сноўборд, абутак) на гадзіну — 9 рублёў па буднях і 12 па выхадных. На ўвесь дзень камплекты можна ўзяць за 20 і 25 рублёў адпаведна;*

*пракат гарналыжнага камплекта для дзяцей (да 12 гадоў) на гадзіну — 5 рублёў па будных днях і 6 рублёў па выхадных. На ўвесь дзень гарналыжны камплект можна ўзяць за 12 і 13 рублёў адпаведна;*

*пракат лыжнага камплекта (лыжы бегавыя, абутак, палкі бегавыя) на дзень — 8 рублёў па буднях, 10 рублёў па выхадных;*

*пракат цюбінга (1 гадзіна) — 6 рублёў па буднях і 8 па выхадных.*

*Кошт пад'ёмніка — ад 2 да 16 рублёў у залежнасці ад часу і схілу.*

## «Сілічы»

Гэты гарналыжны комплекс знаходзіцца прыкладна на адлегласці 32 км ад Мінска ў Лагойскім раёне. Дабрацца туды можна як на асабістым аўтамабілі, так і на аўтобусе № 350, які ходзіць штодня з ДС «Славінскага». Сярод зімовых забавак у цэнтры даступныя катанні на горных і бегавых лыжах, цюбінгу, снегаходзе, а прыемным дадаткам комплексу з'яўляецца коўзанка, дзе аматары не снегу, а лёду могуць атрымаць асалоду ад коўзання на каньках (плануецца, што яна пачне працу ў канцы снежня). Акрамя таго, гарналыжны комплекс «Сілічы» прапануе масу аздараўленчых працэдур для цела і SPA. Тут можна скарыстацца як адкрытымі, так і закрытымі альтанкамі для барбекю (арэнда ад 40 да 130 рублёў у залежнасці ад месцазнаходжання і колькасці чалавек). Але, мабыць, самым важным адрозненнем гэтага комплексу з'яўляецца наяўнасць мноства лыжных трас, розных па працяглассі, складанасці і экстрэмальнасці. Для пачаткоўцаў — аматараў лыжнага спорту працуе школа, дзе кожны можа навучыцца асновам катання на лыжах або сноўбордзе. З панядзелка па суботу комплекс працуе да 22 гадзін, у нядзелю да 20.00.

**Кошты:**

*пракат гарналыжнага або сноўборднага камплекта для дарослых (1 гадзіна) — 8 рублёў па буднях, 11 па выхадных. На ўвесь дзень камплект можна ўзяць за 22 і 27 рублёў адпаведна;*

*пракат гарналыжнага або сноўборднага камплекта для дзяцей (да 12 гадоў, на 1 гадзіну) — 4 рублі па буднях і 5,5 па выхадных. На ўвесь дзень — 11 і 13 рублёў адпаведна;*

*адзін спуск на цюбінгу — 1 рубель 50 капеек, пяць спускаў — 6 рублёў, 10 спускаў — 10 рублёў;*

*бегавыя лыжы — 8 рублёў за 1 гадзіну;*

*снегаход — 10 рублёў за 1 паездку (20,5 км).*

*Кошт пад'ёмніка — ад 2 да 50 рублёў у залежнасці ад часу і дня.*

## «Лагойск»

Гарналыжны комплекс «Лагойск» знаходзіцца на адлегласці 35 км ад Мінска і ўзвышаецца на 82 м. Акрамя асабістага аўтамабіля дабрацца туды вам дапамогуць аўтобусы (№№ 250, 251, 350, 351 з ДС «Славінскага»), якія ходзяць кожныя 20—30 хвілін. У будныя дні комплекс працуе з 14.00 да 23.00, у выхадныя — з 10 гадзін раніцы. Акрамя навагодніх карпаратываў, рэстарана і лазняў, цэнтр прапануе катанне на горных лыжах, сноўбордах і цюбінгах. У комплексе чакаюць аматараў актыўнага адпачынку з розным узроўнем фізічнай падрыхтоўкі, спецыяльна для гэтага прадугледжана гарналыжная школа і 5 трас з асвятленнем, схілы тут розная ўзроўню складанасці з канатнай дарогай. Аматарам затрымацца на схіле даўжэй «Лагойск» падыходзіць ідэальна — па пятніцах і суботах тут арганізаваны начныя катанні (з 22.00 да 02.00).



**Кошты:**

*пракат гарналыжнага або сноўборднага камплекта для дарослых (1 гадзіна) — 8 рублёў па буднях і 10 па выхадных. На ўвесь дзень камплекты можна ўзяць за 20 і 25 рублёў адпаведна;*

*пракат гарналыжнага або сноўборднага камплекта для дзяцей (1 гадзіна) — 4 рублі па буднях і 5 па выхадных. На ўвесь дзень камплекты можна ўзяць за 10 і 12 рублёў адпаведна;*

*начныя катанні — 12 рублёў за камплект і для дарослых, і для дзяцей (на 4 гадзіны).*

*Адзін спуск на цюбінгах — 2 рублі.*

*Кошт пад'ёмніка ад 2 да 20 рублёў у залежнасці ад часу, колькасці пад'ёмаў і дня.*

## «Якуцкія горы»

Парк актыўнага адпачынку «Якуцкія горы» размешчаны за 37 км ад Мінскай кальцавой дарогі ў Дзяржынскім раёне. Непадалёк ад самага высокага пункта краіны — Дзяржынскай гары. Каб даехаць туды на асабістым аўтамабілі, у навігатары дастаткова ўвесці назву вёскі Якуты, а вось дабрацца да парку на іншым транспарце праблематычна. Да 8 студзеня цэнтр плануе працаваць па будных і выхадных днях, а далей толькі па пятніцах, суботах і нядзелях да 22 гадзін. Зімой у «Якуцкіх гарах» вы зможаце пакатацца на горных лыжах, сноўбордзе, цюбінгах, снегаходах і квадрацыклах, пагуляць у пейнтбол, зняць альтанку (ад 50 да 250 рублёў) і без праблем правесці сямейную або карпаратыўную ўрачыстасць. Дарэчы, пра гатоўнасць трас загадзя можна даведацца на сайце цэнтра. Цюбінгавая ўжо гатовая, а гарналыжная адкрыецца ў пачатку студзеня.

**Кошты:**

*пракат гарналыжнага камплекта для дарослых першую гадзіну будзе каштаваць 5 рублёў, кожную наступную гадзіну 2,5 рубля (па буднях). Па выхадных — першую гадзіну 7 рублёў, кожную наступную 3 рублі;*

*пракат гарналыжнага камплекта для дзяцей першую гадзіну будзе каштаваць 3 рублі, кожную наступную гадзіну 1 рубель (па буднях). Па выхадных — першую гадзіну 3,5 рубля, кожную наступную 1,5 рубля;*

*пракат сноўборднага камплекта — першую гадзіну 6 рублёў, кожную наступную — 2 рублі (па буднях). Па выхадных — першую гадзіну 7 рублёў, кожную наступную 3 рублі;*

*пракат цюбінга — 10 рублёў;*

*пракат квадрацыкла (1 круг каля 900 м) — 5 рублёў;*

*туры на снегаходах (траса каля 6 км) — ад 5 да 45 рублёў у залежнасці ад умоў пракату;*

*пад'ёмнік — ад 1 да 11 рублёў у залежнасці ад дня і колькасці пад'ёмаў.*

## Гарналыжны цэнтр «Веста»

Спартыўна-аздараўленчы комплекс «Веста» знаходзіцца за 30 км ад Мінска па кірунку брэсцкай трасы. Дабрацца туды можна як на асабістым транспарце, так і на электрычцы (15—20 хвілін хады да цэнтра) ці на маршрутцы. «Веста» (гарналыжны комплекс) працуе штодня да 21-й гадзіны. Цяпер цэнтр прадстаўляе не толькі летнія, але і зімовыя забавы. Гарналыжны комплекс уключае ў сябе вялікі гарналыжны спуск (абсталяваны бугельным пад'ёмнікам), навучальны спуск, спуск для цюбінгаў і дзіцячую горку. Хто аддае перавагу больш спакойнаму адпачынку, можа пакатацца на каньках або бегавых лыжах.

**Кошты:**

*пракат гарналыжнага камплекта для дарослых (1 гадзіна) — 7 рублёў па буднях і 10 па выхадных. На ўвесь дзень камплект можна ўзяць за 20 і 25 рублёў адпаведна;*

*пракат гарналыжнага камплекта для дзяцей (1 гадзіна) — 3,5 рубля па буднях і 4,5 па выхадных. На ўвесь дзень камплект можна ўзяць за 10 і 12 рублёў адпаведна;*

*пракат сноўборднага камплекта для дарослых (1 гадзіна) — 6,5 рубля па буднях і 9,5 па выхадных. На ўвесь дзень камплект можна ўзяць за 20 і 25 рублёў адпаведна;*

*пракат сноўборднага камплекта для дзяцей (1 гадзіна) — 3,5 рубля па буднях і 4,5 па выхадных. На ўвесь дзень камплект можна ўзяць за 10 і 12 рублёў адпаведна;*

*пракат цюбінга (1 гадзіна) — 7 рублёў па буднях і 8 па выхадных;*

*пракат бегавых лыж (1 гадзіна) — 6 рублёў для дарослых і 5 для дзяцей;*

*кошт пад'ёмніка — ад 3 да 21 рубля ў залежнасці ад часу, колькасці пад'ёмаў і дня;*

*пракат канькоў (1 гадзіна) — 4 рублі для дарослых і 3 для дзяцей;*

*аднаразовае наведванне коўзанкі — 3,5 рубля.*

Напрыканцы адзначым, што амаль ва ўсіх прыведзеных комплексах маюцца снежныя пушкі, якія дазваляюць забяспечваць трасы снегам практычна ў любое надвор'е, таму не засмучайцеся калі паездка ў Букавель або Куршавель пакуль не па кішэні. На лыжах можна пакатацца таксама ў Раўбічах пад Мінскам, у Баярах Маладзечанскага раёна, Мазыры, Магілёве і Рубе Віцебскай вобласці.

* Для падрыхтоўкі матэрыялу выкарыстана інфармацыя сайтаў гарналыжных комплексаў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

## Да тэмы

**Віталь ГРЫЦЭВІЧ, намеснік дырэктара дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Беларусі:**

*— Нашы тураператары прапаноўваюць вельмі шырокі выбар зімовага адпачынку як для нашых грамадзян, так і для замежных. У першую чаргу іх прыцягвае кошт, у нас даволі танныя туры ў параўнанні з іншымі напрамкамі. Ну і, вядома, турыстычная галіна не стаіць на месцы — развіваецца, з'яўляецца ўсё больш новых праграм. Адзін з самых прывабных на сёння кірункаў — спартыўны турызм. Гарналыжныя комплексы ў Сілічах, Лагойску, Мазыры дазваляюць казаць пра тое, што калі раней людзі для занятку любімым відам спорту выязджалі за межы краіны, то цяпер маюць магчымасць займацца гэтым у Беларусі. Прытым за значна меншыя грошы, чым за мяжой, а вось сэрвіс нашых комплексаў не саступае замежным.*

За 9 месяцаў 2016 года Беларусь наведалі 3 мільёны 257 тысяч турыстаў. Сярод тых, хто ўязджае ў краіну, у лідарах расіяне, украінцы, літоўцы, палякі і латвійцы. З больш далёкіх еўрапейскіх краін найбольш часта да нас прыязджаюць немцы. Сярэдняя працягласць знаходжання турыста ў Беларусі — 5 дзён. Гэта адзін з найлепшых паказчыкаў на тэрыторыі СНД.